УДК 327.33(476)(091)

А. А. Райчонак, дацэнт (БДТУ)

# УПЛЫЎ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЙ СТРАТЫФІКАЦЫІ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ. НА ПРАЦЭС ФАРМАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

У дадзеным артыкуле аналізуецца сацыяльная стратыфікацыя насельніцтва Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст., што храналагічна супадае з пераходам беларускай нацыі ў апошнюю стадыю свайго фармавання. Даеццца таксама кароткі агляд становішча ў 5 беларускіх губернях і робіцца спроба прасачыць уплыў эканамічнага стану ў краі на працэс нацыятворчасці ў Беларусі. Аўтар тлумачыць асаблівасці працэсу фармавання беларускай нацыі, што выявіліся ў яго запаволеным развіцці адносна большасці суседніх народаў.

The article examines the social stratification of Belarusian population at the end of the 19th and the beginning of the 20th century. It coincides chronologically with the transformation of the forming Belarusian nation during the last stage of that process. The author gives the short survey of economic situation in five Belarusian provinces and makes the attempt to trace the influence of it on the process of the nation's formation in Belarus. The author's interpretation of some specifics in the process of the Belarusian nation's formation has been undertaken to explain its relative delay towards the neighbouring peoples.

**Уводзіны.** Разглядаючы перыяд канца XIX – пачатку XX ст., перш за ўсё, трэба зазначыць, што ў гэты час беларуская нацыя ўвайшла ў заключную фазу свайго фармавання, і менавіта гэта з'явілася вызначальным фактарам у працэсе стварэння нацыянальнай дзяржаўнасці. Але немагчыма разглядаць працэс фармавання дзяржавы ў адрыве ад тэрыторыі, на якой яна знаходзіцца, а таксама насельніцтва, якое пражывае на дадзенай тэрыторыі. Гэта, у першую чаргу, вымагае падрабязнага разгляду стану беларускага грамадства ў час яго пераходу да мадэрнага стану.

Як вядома, існуюць два асноўныя пункты гледжання на дадзенае пытанне. Першы разглядае нацыю як новы стан больш ранніх людскіх супольнасцей – этнасаў. Другі сцвярджае, што нацыя ёсць нешта прынцыпова іншае ў параўнанні з папярэднімі чалавечымі грамадствамі.

Каб пазбегнуць крайнасцей дзвюх азначаных пазіцый, мы будзем прытрымлівацца думкі, што ўтварэнне нацыі ёсць не што іншае, як змена ўзаемаадносін у грамадстве, якія ствараюць прынцыпова новую сацыяльную рэчаіснасць. У гэтай сувязі разгляд змен у сацыяльна-эканамічным становішчы асноўных пластоў насельніцтва Беларусі дазваляе прасачыць галоўныя змены ў грамадстве падчас утварэння нацыі.

**Асноўная частка.** У сучаснай гістарычнай навуцы пераважае падыход, згодна з якім у статыстыку адносна беларускіх зямель уключаюцца 5 былых губерняў Расійскай імперыі з пераважна беларускім насельніцтвам і тэрыторыя якіх у большай частцы супадае з сучаснай тэрыторыяй Беларусі: Віленская, Віцебская, Гродзенская, Мінская і Магілёўская.

Згодна з перапісам 1897 г., па сацыяльнаму становішчу насельніцтва Беларусі размяркоўвалася наступным чынам: дваранства – 238 522; духавенства – 21 849; купецтва –18 282; мяшчане – 1 781 978; сяляне – 6 416 745, іншаземцы – 13 469, іншыя – 27 473.

Як бачна з прыведзеных вышэй даных, найбольш шматлікім класам на Беларусі было сялянства. Яно складала 92,1% сярод беларускага насельніцтва. Капіталістычнае развіццё беларускай вёскі мела шэраг характэрных асаблівасцей, якія ў значнай меры вызначылі не толькі сацыяльна-эканамічнае, але і палітычнае развіццё беларускай нацыі.

Даследчык парэформенага развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі Л. П. Ліпінскі вылучыў 9 асноўных асаблівасцей, якія значна абцяжарвалі развіццё капіталізму на вёсцы. Галоўнымі сярод іх былі: перавага буйнога памешчыцкага землекарыстання, аграрная перанаселенасць вёскі і запаволеная мабілізацыя зямлі [1].

Трэба дадаць, што з часам аграрная перанаселенасць толькі ўзрастала. У пачатку XX ст. (1900 г.) у 5 заходніх губернях пражывала 2 млн незанятых работнікаў. Звыш паловы дарослага сельскага насельніцтва было залішнім, не знаходзячы на месцы выкарыстання сваёй працы, яны былі вымушаны шукаць яе за межамі радзімы. Па размеру аграрнай перанаселенасці Беларусь займала адно з першых месцаў у Еўрапейскай Расіі.

Калі падсумаваць вышэйсказанае, то становішча ў сельскай гаспадарцы Беларусі магчыма ахарактарызаваць наступным чынам. Асноўная галіна эканомікі Беларусі, сельская гаспадарка, развівалася ў надзвычай неспрыяльных умовах. Беларуская вёска ў пачатку XX ст. уяўляла сабой клубок супярэчнасцей: зямельных, нацыянальных, класавых, юрыдычнага і палітычнага характару, галоўным было зямельнае пытанне.

Менавіта яго вырашэнне прадвызначала шляхі далейшага развіцця Беларусі.

Акрамя таго, супрацьстаянне сялянства як класа эканамічнаму панаванню дваранства дапаўнялася расслаеннем унутры самога сялянства. Калі адразу пасля рэформы 1861 г. яно ўяўляла дастаткова аднародную ў эканамічным сэнсе масу, то да пачатку другога дзесяцігоддзя XX ст. сялянства было ўжо ў значнай ступені дыферанцавана. Згодна з усярэдненым значэннем, да бяднейшага сялянства належала 70%, да сераднякоў – 20%, да заможных – 10% ад сельскага насельніцтва Беларусі.

Адзначым далей, што на Беларусі больш высокімі тэмпамі праходзіла сталыпінская аграрная рэформа. Узровень хутарызацыі склаў тут 12%, тады як па Расіі ў цэлым – 10%. Яшчэ больш інтэнсіўна праходзіў працэс выхаду сялян з абшчыны. Калі па Расіі ў цэлым з яе выйшлі 21,8%, то ў Магілёўскай – 56,7%, а ў Віцебскай – 28,6% (у трох астатніх губернях абшчыннае землекарыстанне фактычна адсутнічала)[2].

Усе названыя супярэчнасці ўзмацніла Першая сусветная вайна. Прыблізна 50% сялян мужчынскага полу былі прызваны ў армію; 7% сялянскіх гаспадарак у Мінскай губерні засталося ўвогуле без работнікаў, у Віцебскай яшчэ больш: да 1917 г. 32,5% гаспадарак апынулася без работнікаў-мужчын.

Акрамя таго, у 1915 г. баявыя дзеянні перамяшчаюцца на тэрыторыю Беларусі і заходняя яе частка трапляе ў зону нямецкай акупацыі, дзе ўсталёўваецца даволі жорсткі ваенны рэжым. Не менш цяжкім было становішча і ва ўсходняй частцы Беларусі. Пад час вайны значна скараціліся пасяўныя плошчы і пагалоўе жывёлы.

Свае асаблівасці мела і развіццё прамысловасці. Агульная характарыстыка дадзенай галіны народнай гаспадаркі выглядае наступным чынам. У 1913 г. у Беларусі налічвалася 1282 цэнзавыя прадпрыемствы з 55 тыс. занятымі на іх рабочымі. Акрамя гэтага, было 98,5 тыс. дробнакапіталістычных прадпрыемстваў і саматужна-рамесных майстэрней з 94 тыс. рабочых. Яшчэ 40 тыс. рабочых былі заняты на чыгунцы, 86 тыс. – у будаўніцтве, лесанарыхтоўцы і як чорнарабочыя, 44 тыс. – у гандлі, сувязі, камунальным і бытавым абслугоўванні і 200 тыс. – у якасці сталых сельскагаспадарчых рабочых. Такім чынам, агульная колькасць сталых наёмных рабочых складала 519 тыс. чалавек.

Аналіз нацыянальнага складу рабочага класа Беларусі быў зроблены гісторыкам М. В. Бічом на падставе перапісу 1897 г. Згодна з яго даследаваннем, у прамысловасці, гандлі, на ўсіх відах транспарту і сродкаў сувязі, а таксама ў ролі хатняй прыслугі і падзёншчыкаў (гарадскіх) былі заняты 289,7 тыс. чалавек, з іх беларусаў – 49,7 тыс. (17,1%), рускіх – 29,4 тыс. (10,1%), палякаў – 29,6 тыс. (10,2%), яўрэяў – 173,5 тыс. (59,9%), літоўцаў – 2,3 тыс. (0,8%), латышоў – 3,6 тыс. (1,3%), украінцаў – 1,6 тыс. (0,6%). Далей ён піша: «Адсутнасць адпаведных крыніц для больш ранняга і больш позняга перыяду не дазваляе прасачыць змены ў нацыянальным складзе прамысловага пралетарыяту Беларусі на працягу ўсёй эпохі капіталізму. Можна, аднак, сцвярджаць, што да 1917 г. значных змен не было, паколькі палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы фарміравання мясцовага пралетарыяту захоўваліся ў аснове тыя ж, што і ў канцы XIX ст.» [3].

Такім чынам, магчыма прыйсці да высновы, што да 1914 г. лічба беларусаў-рабочых у гарадах і мястэчках была прыблізна 54,9 тыс. Калі дадаць да гэтай лічбы 200 тыс. сельскагаспадарчых рабочых, сярод якіх у сілу нацыянальнага складу вёскі было практычна не меньш за 90% беларусаў, атрымаем агульную колькасць беларускага пралетарыяту – прыблізна 250 тыс. чалавек.

Трэба падкрэсліць, што, хаця да пачатку другога дзесяцігоддзя XX ст. буйная прамысловасць абагнала дробную па тэмпах росту, апошняя па лічбе прадпрыемстваў і занятых у ёй рабочых займала пераважнае становішча. Канцэнтрацыя пралетарыяту была невысокай: на адно прадпрыемства прыпадала 43 рабочыя. Большасць цэнзавых прадпрыемстваў (68%) знаходзілася ў сельскай мясцовасці, а колькасць рабочых, якія працавалі па-за горадам, складала 51,4%. Частка рабочых працягвала захоўваць сувязь з зямлёй.

У валавой прадукцыі доля дробнай і рамесна-саматужнай прамысловасці складала 53,5%, а буйнай (цэнзавай) – 46,5%. Такім чынам, у Беларусі працягваў захоўвацца адносна нізкі ўзровень прамысловай вытворчасці і яе канцэнтрацыі. Да Першай сусветнай вайны Беларусь у прамысловых адносінах знаходзілася прыкладна на адным узроўні развіцця з іншымі неіндустрыяльнымі раёнамі і з'яўлялася, па сутнасці, сыравінным і аграрным рэгіёнам Расійскай імперыі.

Яшчэ больш ускладніла становішча прамысловасці Першая сусветная вайна, якая прывяла да значнага скарачэння колькасці прадпрыемстваў і падзення вытворчасці прадукцыі цывільнага прызначэння да 15–16% ад даваеннага ўзроўню.

Значна скарацілася і колькасць пралетарыяту, якая да пачатку 1917 г. склала прыблізна 270 тыс. чалавек. Акрамя таго, узмацніліся і міграцыйныя працэсы: шмат мясцовых рабочых пакінулі Беларусь (былі мабілізаваны на фронт ці ў якасці бежанцаў). Разам з тым прыбылі каля 100 тыс. рабочых, якія былі накіраваны ў ваенныя майстэрні.

Такім чынам, у пачатку XX ст. становішча рабочага класа Беларусі было адным з самых цяжкіх у Расіі. Прамысловасць заставалася слабай, і яе рост стрымліваўся як эканамічнымі, так і пазаэканамічнымі прычынамі. Рабочы клас у сілу вышэйпералічаных абставін не мог адыгрываць значнай ролі ў беларускім нацыянальным руху.

Дастаткова супярэчлівым было і становішча буржуазіі на Беларусі. Па перапісу 1897 г., з 5073,1 тыс. беларускага сельскага насельніцтва да буржуазіі адносілася 463,5 тыс. чалавек, ці прыблізна 9% [4]. З іх каля 1 тыс. (прыблізна 0,02% ад насельніцтва) належалі да буйной буржуазіі; 44,5 (каля 1%) – да сярэдняй і 418 тыс. (каля 8%) – да дробнай. Зыходзячы з таго, што пражытачная норма для адной сялянскай сям'і складала прыкладна 20 дзесяцін, а працоўная – 60 дзесяцін зямлі, то па зямельных уладаннях да дробнай буржуазіі належалі гаспадаркі, якія мелі ад 20 да 60 дзесяцін зямлі, а да сярэдніх – гаспадаркі з уладаннем ад 60 да 500 дзесяцін зямлі.

Фармаванне буржуазіі з невясковага насельніцтва ішло больш паспяхова. Так, яна складала 15%, ці 50,5 тыс. з 335,3 тыс. беларускага насельніцтва гарадоў.

Калі ж браць паказчыкі працэнтных суадносін як для сельскай, так і для гарадской беларускай нацыянальнай буржуазіі, то яны будуць наступнымі: 463,5 тыс. (90,2%) складалі сельскія гаспадары; 7,5 тыс. (1,4%) – гандлёва-прамысловая буржуазія; 43 тыс. (8,4%) не былі непасрэдна звязаны з вытворчасцю (домаўладальнікі, ранцье і г. д.), з іх 1,2 тыс. (0,2%) належалі да буйной; 53,7 тыс. (10,5%) – да сярэдняй і 459,1 тыс. (89,3%) – да дробнай. Усяго ж з 5408,4 тыс. беларускага насельніцтва яна складала 9,5%, ці 514 тыс. чалавек.

Неабходна заўважыць, што ўмовы для развіцця нацыянальнай буржуазіі былі даволі неспрыяльныя. З аднаго боку, яе рост стрымліваўся абмежавальнай палітыкай царызму ў галіне пазямельных адносін, з другога – канкурэнцыяй з прадстаўнікамі буржуазіі іншых нацыянальнасцей, якія пражывалі на Беларусі (палякамі і рускімі ў вёсцы, яўрэямі – у горадзе). Яны ў сілу цэлага шэрага прычын былі больш моцнымі ў эканамічным сэнсе.

Удзельная вага нацыянальнай буржуазіі сярод палякаў складала 25,5%; рускіх – 23,5%; яўрэяў – 18%. З агульнай колькасці прадстаўнікоў буржуазнага класа на долю беларускай буйной буржуазіі ў 5 заходніх губернях прыпадала 2,7%, ў той час, як яўрэям належала 44,7%; палякам – 32,4%; рускім – 15,8%.

Такім чынам, можна канстатаваць, што беларуская нацыянальная буржуазія не з'яўлялася пануючым класам, гэта рабіла яе патэнцыйнай саюзніцай як нацыянальна-вызваленчага, так і агульна дэмакратычнага руху. Іншая справа, што ў сілу незавершанасці працэсу класавай дыферэнцыяцыі беларускага грамадства, яна ў агульнай сваёй масе да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. так і не паспела ўсвядоміць сябе як клас.

Закранаючы іншыя сацыяльныя пласты і групы, адзначым наступнае: сярод інтэлігенцыі да беларусаў аднеслі сябе 40% чыноўнікаў, 10% юрыстаў, 20% лекараў, 29% паштова-тэлеграфных служачых і 60% настаўнікаў [5].

Такім чынам, беларуская нацыя ў пачатку XX ст. знаходзілася ў заключнай стадыі фармавання, і хаця некаторыя працэсы не былі канчаткова завершаны, аб'ектыўна яна была падрыхтавана да ўспрыняцця і ажыццяўлення ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці.

Напрыканцы хацелася б коратка спыніцца на фактарах аб'ектыўнага і суб'ектыўнага характару, якія ў далейшым у многім абцяжарылі працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці:

1) незавершанасць класавай і сацыяльнай дыферэнцыяцыі беларускага грамадства, што, у сваю чаргу, запавольвала развіццё нацыянальнай самасвядомасці, выкрышталізацыі ў розных сацыяльных груп сваіх спецыфічных інтарэсаў у справе ўтварэння нацыянальнай дзяржаўнасці;

2) вайсковыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі не толькі прынеслі рэзкае пагаршэнне сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, але і прывялі да таго, што галоўны арэал кансалідацыі беларускай нацыі, які вызначаецца навукоўцамі як тэрыторыя Паўночна-Заходняга і часткі Цэнтральнага рэгіёнаў, аказаўся адрэзаным лініяй фронту ад галоўнага нацыянальнага цэнтра, якім на той час становіцца Мінск. Што тычыцца ўсходніх тэрыторый Беларусі, то яны не маглі ўзяць на сябе гэтую функцыю ў сілу таго, што палітыка русіфікацыі прынесла найбольшыя вынікі менавіта на гэтых землях. З 1897 па 1913 г., па афіцыйнай статыстыцы, у Магілёўскай губерні доля беларускага насельніцтва знізілася з 82 да 50,3% [6]. Акрамя гэтага, вайна прывяла да таго, што значная колькасць людзей, здольных падтрымаць намаганні па стварэнню беларускай дзяржаўнасці, былі адарванымі ад Беларусі (1320 тыс. бежанцаў і яшчэ каля 500 тыс. мабілізаваных у дзеючую армію). У рашучыя 1917–1919 гг. яны знаходзіліся па-за яе тэрыторыяй;

3) для нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння неабходна не толькі прадуцыраванне дзяржаўнай ідэі, але і наяўнасць класа, здольнага ўспрыняць яе ў поўным аб'ёме, а гэта забяспечваецца наяўнасцю ў грамадстве пэўнага адукацыйнага ўзроўню, у Беларусі ж адсутніча-

ла сістэма вышэйшай адукацыі, а менавіта вышэйшыя навучальныя ўстановы, як сведчыць вопыт еўрапейскіх краін, з'яўляюцца цэнтрамі, якія прадуцыруюць нацыянальна-дзяржаўныя ідэі і кадры, здольныя здзейсніць гэтыя ідэі ў жыццё. Істотнай перашкодай з'яўлялася і адсутнасць якога-небудзь вопыту дзяржаўнай працы ў пераважнай колькасці ўдзельнікаў нацыянальнага руху.

4) наяўнасць нявырашаных эканамічных праблем, у першую чаргу зямельны крызіс і ваенныя разбурэнні, выставіла на пярэдні план эканамічныя патрабаванні, пры гэтым вайна не парадзіла, а абвастрыла гэтыя супярэчнасці. Так, у 1913 г. даход на душу насельніцтва ў Расіі складаў 97 руб. 26 кап., а ў Беларусі – 65 руб. 86 кап. Значнае адставанне Беларусі ад усёй Расіі бачым з даных аб структуры нацыянальнага даходу. Удзельная вага сельскай гаспадаркі ў нацыянальным даходзе Беларусі складала 57,5%, тады як па ўсёй Расіі – 47,5%. Суадносна ўдзельная вага прамысловасці (без лесанарыхтовак) складала ў Беларусі 15,3%, а па ўсёй Расіі – 24,3%; удзельная вага буйной (цэнзавай) прамысловасці: у Беларусі – 7,2%, а ў Расіі – 18,3%. Гэтыя лічбы красамоўна сведчаць аб тэхніка-эканамічнай адсталасці Беларусі ў складзе Расійскай імперыі.

Тым не менш тут назіраўся пераход ад традыцыйнага грамадства да мадэрнізаванага. Змены ў сацыяльнай структуры грамадства і паступовае ўцягванне насельніцтва ў капіталістычныя адносіны спрыялі фармаванню нацыянальнай свядомасці. Але тут трэба ўлічваць заўвагу, зробленую С. Токцем, што гэтыя ж з'явы паскаралі таксама працэс асіміляцыі і далучэння беларускага насельніцтва да іншых нацыянальных супольнасцей [7].

Атрымлівалася, што сацыяльна-эканамічныя перадумовы, неабходныя для фармавання нацыі, не заўжды спрацоўвалі ў накірунку пераўтварэння беларускай этнічнасці ў беларускую нацыю. У пэўнай ступені гэта было звязана з тым, што, як вядома, беларусы належалі да так званых нацый з няпоўнай сацыяльнай структурай, але адной з асаблівасцей беларускай нацый было тое, што яна фармавалася практычна ва ўмовах нязначнасці беларускага гарадскога насельніцтва. Трапляючы ў гарады, дзе пераважалі іншыя этнічныя групы, беларусы былі вымушаны прыстасоўвацца да гэтых умоў, а ўлічваючы тое, што гарадское насельніцтва Беларусі ў пачатку XX ст. не перавышала 15% ад усяго насельніцтва, не прыходзілася разлічваць на моцную падтрымку беларускага нацыянальнага руху з боку гараджан.

Другой супярэчлівай рысай была роля адукацыі, якая ва ўмовах Расійскай імперыі пазбавілася нацыянальнага зместу. Таму, з аднаго боку, прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху выступілі з патрабаваннем увядзення нацыянальнай сістэмы адукацыі і адкрыцця вышэйшых навучальных устаноў на тэрыторыі Беларусі, што павінна было спрыяць больш хуткаму пераходу беларускага этнасу ў стан нацыі. З другога боку, імперская сістэма адукацыі яшчэ больш паскарала працэс размывання этнічнасці беларусаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, можна казаць, што да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Беларусь заставалася адным з прыгнечаных рэгіёнаў Расійскай імперыі як у эканамічным, так і ў нацыянальным плане. Але мадэрнізацыйныя працэсы паступова пачынаюць ахопліваць усе асноўныя сацыяльныя групы грамадства. Хоць і запаволена, але трансфармацыя аграрнага грамадства ў мадэрнае набывае незваротны характар. Між тым названыя працэсы не насілі лінейнага характару і вызначаліся няроўнасцю хуткасці цячэння ў розных рэгіёнах Беларусі. Нацыянальны рух насіў тут нацыянальна-вызваленчы характар, а высокая сацыяльная напружанасць прывяла да таго, што, як толькі рухнула самаўладдзе і з'явілася магчымасць якой-небудзь легальнай працы, гэты рух пачаў імкліва развівацца, уцягваючы ў працэс нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва тысячы новых людзей.

## Літаратура

1. Липинский, Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.) / Л. П. Липинский. – Минск: Наука и техника,1971. – С. 228–233.

2. Экономика Белоруссии в эпоху империализма 1900–1917 гг. – Минск: Издательство АН БССР, 1963. – С. 127,141.

3. Біч, М. В. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі у канцы XIX – пачатку XX ст. / М. В. Біч // Весці Акад. навук Беларускай ССР. Сер. грамадскіх навук. – 1972. – № 4. – С. 35–36, 38.

4. Шыбека, З. В. Буржуазія: у 2 т. / З. В. Шыбека // ЭГБ. – Т. 2. – С. 135–138.

5. Церашковіч, П. У. Беларусы: у 2 т. / П. У. Церашковіч, І. У. Чаквін // ЭГБ. – Т. 1. – С. 472.

6. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.

7. Токць, С. М. Беларуская вёска на мяжы эпох: змены этнічнай самасвядомасці сялянскага насельніцтва ва ўмовах распаду традыцыйнага аграрнага грамадства (па матэрыялах Гарадзеншчыны XIX – першай трэці XX ст.) / С. М. Токць. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 25.

*Пастпупіў 02.04.2010*